# КРЫЖ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ – НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РЭЛІКВІЯ БЕЛАРУСАЎ

**Пракаповіч Дзмітрый Юр'евіч, Рэспубліка Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кансультант – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

Анатацыя. Мэта работы – пошук і ўзнаўленне інфармацыі з гісторыі мінулых гадоў. Актуальнасць работы заключаецца ў тым, што да гэтага часу не быў знойдзены арыгінал жыватворнага сімвала Бацькаўшчыны, пра які ў шматлікіх выдавецтвах і часопісах можна знайсці шмат інфармацыі пра найвялікшы скарб Беларусі.
*Ключавыя словы: крыж, скарбы, Ефрасіння Полацкая, багацце, духоўнасць, знікненне, духоўнасць.*

Помнік беларускага пісьменства

Крыж быў выраблены майстрам Лазарам Богшам у 1161 годзе па просьбе асветніцы. Гэта быў сапраўдны шэдэўр. Крыж меў шасціканцовую форму, шырокае выкарыстанне якой у Заходняй Еўропе пачалося ў VII – VIII стст. Шасціканцовы крыж быў цесна звязаны з Візантыйскай традыцыяй.

На верхніх канцах крыжа Ефрасінні Полацкай былі змешчаны выявы Ісуса Хрыста, Багародзіцы і Іаана Прадцечы; у цэнтры ніжняга перакрыжавання знаходзіліся выявы чатырох евангелістаў: Лукі, Матфея, Марка і Іаана; па баках – архангелы Гаўрыіл і Міхаіл, знізу – святая Ефрасіння Александрыйская і святыя мучанікі Георгій і Сафія.

У пяці квадратных гнёздах, размешчаных у сярэдзіне крыжа, знаходзіліся наступныя рэліквіі: кропля крыві Ісуса Хрыста, часцінка крыжа, на якім Хрыстос быў распяты, драбок каменя ад гроба Багародзіцы, часткі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроў святога Дзімітрыя, Дзімітрыя і Панцеляймона.

Надпісы на крыжы

Першая, дзелавая частка захаванага на Крыжы тэксту напісаная на гэтак званай старажытнарускай мове, а ў другой аўтар (верагодна, сама Еўфрасіння) звяртаецца да царкоўнаславянскае і выкарыстоўвае ўласцівыя рэлігійнай літаратуры вобразы.

Знікненне крыжа

Крыж Ефрасінні Полацкай мае і сваю ўласную драматычную біяграфію. Ён не аднойчы пакідаў межы Беларусі. Некаторы час ім валодаў Іван Грозны. Аднак спужаўся праклёну выкрадальнікам, напісаным на Крыжы, і палічыў за лепшае вярнуць яго ў Полацк, што і зрабіў у 1563 г., калі захапіў горад. З канца XVI ст. да 1841 г. Крыж захоўваўся ў полацкім Сафійскім саборы. У час нашэсця Напалеона рэліквію замуравалі ў яго сцяне. У 1841 – 1842 г. полацкі архіепіскап Васіль Лужынскі вазіў Крыж у Маскву і Пецярбург, каб з яго дапамогай сабраць

сродкі для сваёй епархіі. З 1842 г. да 1928 г. Крыж зноў захоўваўся ў Полацку, у Спаса-Ефрасіньеўскім храме, пабудаваным у XII ст.

У 1921 г. бальшавіцкія ўлады экспрапрыявалі гэту рэліквію, як і шмат іншых дарагіх царкоўных каштоўнасцяў, і аддалі на захоўванне ў мясцовы фінаддзел. У 1928 г. Крыж передалі ў Мінск, у Беларускі дзяржаўны музей. Тым самым днём датаваны і акт аб перадачы Крыжа Еўфрасінні ў рукі Лугаўцова. У гэты час В. Ластоўскі ўжо не працаваў дырэктарам, аднак нацыянальную рэкліквію ён передаваў «чэкісту» яшчэ за сваім подпісам, бо, відаць, быў за яе асабіства адказны. Зрэшты, дамо слова самому дакументу, захаваўшы яго арфаграфію і пунктуацыю.

Магілёўскі збор каштоўнасцяў складаўся ў асноўным з царкоўнага начыння, забранага ў 20-я гады ў царквы: многія дзесяткі старажытных ікон, у тым ліку ў каштоўных акладах, кніг; прадметы культа і інш. Найвялікшым рарытэтам магілёўскай калекцыі ў 1928 г. стаў Крыж Ефрасінні Полацкай – адна з самых шанаваных святынь праваслаўнага свету.

Загадкавае знікненне Крыжа ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны нарадзіла шмат чутак і падазрэнняў. У пасляваенныя гады пошукамі Крыжа ніхто не займаўся. Цікавасць да сваёй страчанай святыні стала праяўляцца ў Беларусі толькі з атрыманнем ёй незалежнасці.

Сляды вядуць у Расію

Паводле полацкай версіі знікнення Крыжа, ён застаўся там, дзе і быў зроблены. Калі ў 1920-я г. савецкая ўлада праводзіла экспрапрыяцыю царкоўнай маёмасці, полацкае духавенства здало копію, падробку Крыжа. Полацкая падробка папала ў Мінск, потым у Магілёў і была вывезена далей.

На жаль, тайну знікшай рэліквіі да сённяшняга дня раскрыць не ўдалося. Пошукамі займаюцца супрацоўнікі Інтэрпола, які зарэгістраваў прапаўшую беларускую рэліквію пад нумарам 34-1130, і КДБ Беларусі. Знайсці Крыж і вярнуць яго ў скарбніцу нашага гістарычнага багацця мараць вучоныя.

У той заблытанай, тупіковай сітуацыі ў пачатку 1990-х г. нарадзілася ідэя аб аднаўленні ў сваім гістарычным выглядзе страчанай рэліквіі. Гэты ўнікальны выраб зрабіў брэсцкі нашчадак Лазара Богшы – мастак-эмальер Мікалай Кузьміч, за што бібліяграфічны цэнтр Кембрыджскага універсітэта (Вялікабрытанія) прысвоіў яму званне «Чалавек стагоддзя». Адноўлены крыж, асвечаны мітрапалітам Філарэтам, мае ўжо самастойную духоўна-культурную каштоўнасць.

Копіі крыжа

Колькі слоў неабходна сказаць і пра копіі крыжа. Як адзначае Уладзімір Арлоў, у «Хроніцы Быхаўца» ёсць згадка пра дачку полацкага князя Васіля Параскеву, што была абвешчана ў Рыме святою пад імем Праксэды. Гэтая князёўна пастрыглася ў манастыр Спаса над Палатой, дзе сем гадоў перапісвала кнігі. Потым аддана служыла Богу ў Рыме, дзе памерла і была пахавана; там у яе гонар пабудавалі бажніцу. Некаторыя лічаць гэтае летапіснае апавяданне каталіцкай рэдакцыяй жыццяпісу Ефрасінні. Захаваліся звесткі і пра крыж з надпісам і часткай святога дрэва, падараванага Праксэдзе рымскім папам

Аляксандрам IV. Гэты крыж і з'яўляецца першай копіяй крыжа Ефрасінні Полацкай. Цяпер ён знаходзіцца ў Яраслаўска-Растоўскім музеі-запаведніку. Другая, вядомая копія, была зроблена езуітамі з мэтаю выкрадання арыгінала з уніяцкага Сафійскага сабора. І, нарэшце, самая вядомая копія – зробленая ў наш час у 1997 годзе майстрам з Брэста Мікалаем Кузьмічом. Сам Філарэт прывозіў з Ерусаліма для крыжа часткі мошчаў святых, часткі камянёў з Гроба Гасподняга і Гроба Багародзіцы. Цяпер гэтая копія захоўваецца ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры ў Полацку.

Заключэнне

Дзейнасць Ефрасінні Полацкай пакінула след не толькі ў гісторыі, але і ў душы беларускага народа. Ефрасіння стала сімвалам духоўнага служэння сваёй Радзіме, невычэрпнай крыніцай маральнай сілы і духоўнага адраджэння нашага народа. Яе царкоўнае шанаванне пачалося на Беларусі ў канцы XII ст. без афіцыйнай кананізацыі. Тады ж невядомым аўтарам у Полацку было напісана «Жыціе святой і найпрападобнейшай Ефрасінні» – адзін з найбольш ранніх твораў гістарычнай прозы. Яно ўслаўляе настойлівую і самаахвярную жанчыну, яе імкненне да ведаў і дасканаласці. Да нас дайшло больш за 130 спісаў «Жыція», зробленых у наступныя стагоддзі, што сведчыць пра шанаванне асветніцы ў мінулым. Былі створаны царкоўныя спевы пра Ефрасінню, самыя старажытныя з якіх узыходзяць да XII ст. У Маскоўскай Русі Ефрасіння Полацкая стала шырока вядомая ў XVI ст., калі мітрапаліт Макарый уключыў яе «Жыціе» ў «Мінеі-чэцці». Яна стала першай жанчынай, кананізаванай Рускай праваслаўнай царквой (1547 г.). Была прызнана святой таксама каталіцкай царквой.

**Літаратура**

1. Аляксееў Л. В. Лазар Богша – майстар-ювелір XII в. // Савецкая археалогія. – 1957, № 3.
2. Аляксееў Л. В., Макарава Т. И., Кузьміч Н. П. Крыж – захавальнік усяе сусвету. – Мн .: Веснік Беларускага Экзархата, 1996.
3. Аляксееў Л. В. Па Заходнай Дзвіне і Дняпру ў Беларусі. – М.:Мастацтва, 1974.
4. Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу: да 900-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай. – Мн.: Дэполіс, 2002. – Ч. 1.
5. Габрусь Т. Сілуэты Полацка // Роднае слова. – 2003, № 8. – С. 92-99.
6. Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны: Гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай / Аўт.-уклад. У. А. Арлоў. – Мн.: Асар, 1998.

Репозиторий БГМУ

# THE CROSS OF ST. EUPHROSYNE OF POLOTSK – THE NATIONAL RELIC OF THE BELARUSIANS

**Prakopovich Dmitriy Yurievich, Belarus**
*Belarusian state medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor – Ratynskaya N.V.*

Abstracts. Purpose – to search for and recovery of information from the history of past years. Relevance of the work lies in the fact that until now had not found the original life-giving symbol of the motherland, which in many publishing houses and magazines you can find a lot of information about the greatest treasure of Belarus.
*Keywords: cross, treasure, Euphrosyne of Polotsk, wealth, spirituality, loss of spirituality.*

Репозиторий БГМУ